Тацяна Лашкевіч

# “Дзеці Зямлі” пайшлі ў лясы

Зялёны аўтобус, расплёскваючы вакол сябе дзіцячы сьмех і гітарныя акорды, упэўнена рухаўся вулачкамі Бабруйску, і выехаўшы за рысу гораду паглыбляўся ўсё далей, увозячы ўсіх у блакітназялёную далячынь. Што гэта за людзі, куды яны імкнуцца, чаго шукаюць?…

Каля трыццаці падлеткаў — пераважна вучні старэйшых клясаў бабруйскіх школак — бралі ўдзел у экспэдыцыі “Дзеці Зямлі” на тэрыторыі Сьвіслацка-Бярэзінскага нацыянальнага парку. Асноўнай задачаю гэтай, сёмай па ліку, экспэдыцыі сталася праведзеньне экалягічнага маніторынгу гідралягічнага заказьніку “Выспы Дулебы”. Экспэдыцыя падзеленая на дзьве групы, што разыходзяцца ў розныя месцы парку дзеля дасьледаваньняў і практыкаў. Адная з групаў рухаецца пешшу, зьбіраючы інфармацыю, другая адпраўляецца Сьвіслаччу на байдарках, вызначаючы стан воднага сьвету самое ракі ды ейных прытокаў, а таксама стадыі дэградацыі лясных экасыстэмаў. Праз дванаццаць дзён групы сустракаюцца ў раёне сяла Краснае для таго, каб, склаўшы разам усю інфармацыю, правесьці маніторынг паводле вынікаў дасьледаваньняў.

Экспэдыцыя “Дзеці Зямлі” зарганізаваная Экалягічнай станцыяй



"Ольса" і Цэнтрам "Бабраня". Такія экспэдыцыі "Ольса" праводзіць ужо ня першы раз, і летась у экалягічнай вандроўцы ўзялі ўдзел паўсотні юных аматараў прыроды зь мясцовых школак. Штогод на падставе атрыманых дадзеных экалягічная станцыя "Ольса" рыхтуе звароты ў органы ўлады, якія мусяць падтрымліваць належны запаведны рэжым на падахоўных тэрыторыях поплаваў Бярэзіны й Сьвіслачы між Бабруйскам і Ялізавым. А перад экспэдыцыяй — з 18 да 22 чэрвеня "Ольса" праводзіла ачыстку тэрыторыі былога кар'еру на ўскрайку Бабруйску, дзе з крыніцаў утварылася возера. Плянуецца стварыць вакол гэтага возера месца для адпачынку — "Белы бераг".

Турыстычны цэнтар "Бабраня", створаны ў 1964 годзе, за гады свайго йснаваньня пасьпеў выхаваць не адное пакаленьне хлапцоў і дзяўчатаў. Асноўныя кірункі дзейнасьці Цэнтру — турызм і краязнаўства. Цікавая праца й добры адпачынак. Кіраўніца экспэдыцыі Сьвятлана Максімовіч распавядае пра свой прыход у цэнтар у 1989 годзе, пра выхавальнікаў — цяперашніх і ўжо пасталелых. У памяці ня толькі вандроўкі роднымі мясьцінамі, але й вандроўкі на Каўказе й Цяньшані, зарганізаваныя адным з кіраўнікоў цэнтру Леанідам Семчанкам .

Акунаючыся ў сьвет цэнтру, хлопцы й дзяўчаты незаўважна для сябе зьмяняюцца, знаходзячы новыя каштоўнасьці ды інтарэсы ў жыцьці. Не дарэмна адзін з выхавальнікаў Дзяніс Клімаў кажа, што цэнтар для яго — гэта лад жыцьця.

Кіраўнікі ўзгадваюць розныя цікавыя выпадкі з жыцьця экспэдыцыі. Аднойчы адзін з хлапцоў — Андрэй Макарчанка — нечакана прапанаваў астатнім сысьці ў лес з тым, што было ў кішэнях. Прапанова была падтрыманая з энтузіязмам. Вярнуўшыся праз двое сутак, яны яшчэ доўга ўзгадвалі, як здабывалі агонь і рыхтавалі начлег, спрабавалі выжыць у халодным лесе. Пагадзіцеся, што пасьля такіх выпрабаваньняў гэтыя падлеткі нідзе ня страцяцца.

Аднак, бліжэй да справы… Кожны ранак пачынаецца з "радыяльных выхадаў". Абаснаваўшыся на новым месцы, удзельнікі карпатліва вывучаюць навакольнае асяродзьдзе, праходзячы за дзень да дваццаці кілямэтраў. Адначасова выконваецца некалькі задачаў: гэта й вызначэньне стадыяў дэградацыі дадзенай экасыстэмы, і біяіндыкацыя забруджваньня вадаёмаў, і правядзеньне экалягічных акцыяў з прыборкаю і ўладкаваньнем тэрыторыяў. Праводзіцца прапаганда экалягічных ведаў сярод тамтэйшых жыхароў.

Важным чыньнікам ёсьць непасрэдная сувязь удзельнікаў экспэдыцыі зь мясцовымі жыхарамі й лясьніцтвамі. Стала праводзіцца апытаньне пра адносіны да дзейнасьці экспэдыцыі, тэставаньне, распаўсюджваюцца ўлёткі, што падкрэсьліваюць важнасьць ведаў пра стан экасыстэмаў. Вядзецца праца ў зборы геаграфічных назваў, старажытных лягендаў і паданьняў. Звычайна людзі даволі ахвотна йдуць на кантакт, але, да вялікага шкадаваньня ўдзельнікаў экспэдыцыі, вельмі мала цікавяцца станам навакольнага асяродзьдзя... А самыя малодшыя дзеці займаюцца зборам гербарыяў, апісаньнем і фатаграфаваньнем рэдкіх кветак і траваў.
Кожная з групаў забясьпечаная мапай раёну, на якой адзначаюцца месцы экалягічных парушэньняў.
У шмат якіх лясьніцтвах заўважаліся істотныя парушэньні: незасаджаныя высечкі, празьмерны збор маладога здаровага лесу. Летась у раёне хутара Ігнатаўка былі знойдзеныя цэлыя кварталы зьнішчаных лясоў. Паводле фактаў парушэньняў складаюцца акты, якія потым падаюцца да разгляду ў Міністэрства прыродных рэсурсаў.
Варта адзначыць шчыльны кантакт з Бабруйскай гарадзкой і раённай інспэкцыямі, якая інфармацыяй і фінансавым чынам імкнецца падтрымліваць энтузіястаў. А ў сваю чаргу, экалягічная станцыя “Ольса” прыкладае намаганьні ў пашырэньні кола грамадзкіх інспэктараў, скарыстоўваючы магчымасьці, закладзеныя ў дзейсным заканадаўстве.
Сёлетняя экспэдыцыя “Дзеці Зямлі –2000” прысьвечаная пераважна вызначэньню экалягічнага стану вадаёмаў. Дакладнае вызначэньне якасьці вады — няпростая задача. У дапамогу ўдзельнікам экспэдыцыі з Бабруйску выяжджае адна з супрацоўніцаў гарадзкой і раённай інспэкцыі, загадчыца лябараторыяў Натальля Паддубская. Менавіта такія спэцыялісты патрабуюцца цэнтру. На працягу ўсяе працы вядзецца сваесаблівы летапіс, дзёньнік экспэдыцыі. З гэтай напрацаванай інфармацыяй удзельнікі потым ідуць на рэгіянальныя ды агульнанацыянальныя сэмінары.
Па заканчэньні самой экспэдыцыі дзейнасьць цэнтру не спыняецца. Пройдзе крыху часу, і паводле вынікаў будуць абараняцца рэфэраты, праводзіцца канфэрэнцыі.
Дзеці жадаюць і гатовыя вучыцца. І сапраўды прыемна знаходзіцца сярод зацікаўленых і ўпэўненых у сабе й сваіх сілах людзей.

## Антыфашыстоўскі конкурс

Моладзевы Антыфашыстоўскі Цэнтар абвяшчае конкурс на лепшы антыфашыстоўскі малюнак “Беларусь бяз свастыкі”. Работы прымаюцца ў любым выглядзе й любога фармату, якія дасылайце на адрэсу:
МАЦ, а/с 62, г. Горадня-3, 230003, БЕЛАРУСЬ

* * *

У суботу 19 жніўня ля вёскі Дружная Мядзельскага раёну была адкрытая **першая ў Беларусі ветраэнэргетычная ўстаноўка**. Яна мае вышыню 50 мэтраў, кошт праекту — 400 тысячаў нямецкіх марак. Мяркуецца, што агрэгат зможа выробляць да 400 тысячаў кілёватгадзінаў электраэнэргіі ў год.
У Заходняй Эўропе такія ветракі акупаюцца прыкладна за 8 год. Вятрак быў усталяваны ў вёсцы "чарнобыльскіх" перасяленцаў на ахвяраваньні нямецкае грамадзкасьці зь ініцыятывы арганізацыі «Дамы замест Чарнобылю», якую падтрымалі 2,5 тысячы жыхароў Нямеччыны.

**Заказьнікі**
На прыканцы жніўня ўтвораны Рэспубліканскі біялягічны заказьнік «Пякалінскі», разьмешчаны на тэрыторыі Смалявіцкага лясгасу ў Смалявіцкім раёне Менскае вобласьці на плошчы 2128,9 гэктары. Значна пашырыў сваю тэрыторыю біялягічны заказьнік "Спораўскі" ў Бярозаўскім раёне Берасьцейскае вобласьці. Рэч у тым, што на далучанай дзялянцы выяўленая адна з найбуйнейшых у Эўропе папуляцыяў рэдкіх птушак — вяртлявае камышоўкі, а таксама атрыманыя новыя зьвесткі пра паграджальны стан нізінных балотаў у Беларусі ды Эўропе ўвогуле.

* * *

У Менскім батанічным садзе цягам двух тыдняў працавалі студэнты з розных краінаў — Японіі, Італіі, Нямеччыны, Чэхіі, Мэксікі. Усе яны сябры міжнароднай маладзёвай арганізацыі «Новая Група». Беларусь прывабіла моладзь як нязьведаная і таямнічая краіна.

**Tacis укладвае грошы ў Прынёманьне**
Чакаецца, што ў сьнежні сёлета ў Горадні распачне працу група Tacis, якая зоймецца праблемаю чысьціні Нёману й Сьвіслачы. А цяпер на Гарадзеншчыне фінішуе праект "Рэгіянальнае разьвіцьцё і ахова прыроды ў эўрарэгіёне "Нёман" у праграме трансмежавага супрацоўніцтва Tacis — на ягоную рэалізацыю Эўрапейскім Зьвязам выдаткаваны 1 мільён эўра. Праект скіраваны на ахову гісторыка-культурных і прыродных багацьцяў Прынёманьня, разьвіцьцё рэгіянальнага й міжнароднага турызму.

**Таварыства аховы жывёлаў рэгіструецца ў Горадні**
У плянах новай арганізацыі — адкрыцьцё прытулку для бяздомных сабак і котак, прапаганда гуманнага, міласэрнага стаўленьня да ўсяго жывога праз мэдыі, навучальныя і дашкольныя ўстановы.
Зьвязвайцеся зь Юрам Аўчыньнікавым, т. 47-02-47.